# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Штаб. Рвач. Кораб. Ананас. Аладкі. Сігма. Манга. Вісус. Крэсла. Авал. Бёрда. Яга. Ага. Канат. Тахта. Ета. **Па вертыкалі:** Такса. Бурак. Арба. Нага. Рукамыйнік. Аніс. Наган. Слава. Мова. Гну. Саванё. Салата. Робат. Страх. Агат. Ёга. Ака.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.46 | 18.01 | 9.15 |
| Віцебск — | 8.40 | 17.47 | 9.07 |
| Магілёў — | 8.37 | 17.52 | 9.15 |
| Гомель — | 8.28 | 17.53 | 9.25 |
| Гродна — | 9.01 | 18.17 | 9.16 |
| Брэст — | 8.57 | 18.23 | 9.26 |

### Месяц

*Першая квадра 2 лютага.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандра, Анатоля, Віталя, Майсея, Піліпа, Пятра, Рыгора, Уладзіміра, Фелікса.*
*К. Рамуальда, Рышарда.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 7 ЛЮТАГА




**1915** год — нарадзіўся Мікалай Трафімавіч Маструкоў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944 г., пасмяротна). Ваяваў на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, Цэнтральным, Беларускім франтах. Удзельнік баёў пад Масквой. Камандзір кавалерыйскага эскадрона лейтэнант Маструкоў асабліва вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім раёне. Загінуў у 1943 годзе.



**1925** год — нарадзілася Людміла Іванаўна Сторажава, актрыса, заслужаная артыстка Беларусі (1966). З 1959 года служыла ў Брэсцкім, з 1962-га — у Гродзенскім, у 1968—1974 гадах — у Гомельскім абласных драматычных тэатрах. Выканаўца драматычных і характарных роляў. Найбольш з іх — Ганна Карэніна («Ганна Карэніна» Льва Талстога), Манахава («Варвары» Максіма Горкага), Клеапатра («Антоній і Клеапатра» Уільяма Шэкспіра).

**1945** год — нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Марцынюк, акцёр, заслужаны артыст Беларусі (1991). З 1969 года служыў у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача, з 1976-га — у Гродзенскім абласным драматычным тэатры. Сярод роляў — Куторга («Пінская шляхта» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча), Алег Кашавой («Маладая гвардыя» Аляксандра Фадзеева) і іншыя.




**1855** год — у горадзе Сімода адміралам Яўхім Пуцяціным падпісаны першы руска-японскі дагавор. Паводле дамовы, усталёўваліся «пастаянны мір і шчырае сяброўства паміж Расіяй і Японіяй». Для рускіх суднаў былі адкрыты парты Сімода, Хакадатэ і Нагасакі. У першых двух дазваляўся ўзаемны гандаль і ў адным з гарадоў магло быць адкрыта рускае консульства. Да Японіі адышла паўднёвая частка Курыльскіх астравоў, а востраў Сахалін заставаўся ў сумесным валоданні.

**1870** год — нарадзіўся Пётр Бернгардавіч Струвэ, рускі эканаміст, філосаф, гісторык і публіцыст, тэарэтык «легальнага марксізму».



**1920** год — Чырвонай Арміяй вызвалена ад белагвардзейцаў Адэса.

**1960** год — нарадзіўся Джэймс Спэйдар, амерыканскі кінаакцёр. Здымаўся ў фільмах «Секс, хлусня і відэа», «Благі ўплыў», «Воўк», «Аўтакатастрофа» і інш.

**1960** год — нарадзіўся Дзітэр Болен, нямецкі поп-музыкант (гурты Modern Talking, Blue System).

**1964** — гурт The Beatles прыбыў у Нью-Ёрк, дзе ў аэрапорце імя Кенедзі яго сустракалі тры тысячы прыхільнікаў. Гісторыкі поп-культуры потым назвалі гэты дзень пачаткам «брытанскага ўварвання» ў Амерыку.

## УСМІХНЕМСЯ

Адны і тыя ж рэчы часта выглядаюць зусім па-рознаму, калі глядзець на іх з розных бакоў. Вось выхадныя, напрыклад, выглядаюць па-рознаму ў пятніцу ўвечары і ў панядзелак раніцай.

**— Мне бульбы не трэба, мамачка, мне трэба пустую талерку, поўную катлет!**

Адзін сусед кажа другому:
— Вырашыў праверыць словы пра тое, што калі шчыльна паесці і пайсці ў супермаркет, то купляць ежу не будзе жадання. І ты ведаеш, сапраўды! Гляджу на ежу — нічога не хочацца. Вось узяў каньяк.

**Строга асудзіў сябе. Але прыняўшы пад увагу ўсе змякчальныя акалічнасці, абмежаваўся строгай вымовай.**

У адных брушны прэс кубікамі, у іншых — купалам.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 374.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 лютага 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12